Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навуковай рабоце
_____________ В.Р.Языковіч
______________ 2020

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ
**Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы**
спецыяльнасці перападрыхтоўкі
1-23 02 71 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія
кваліфікацыя: *бібліятэкар-бібліёграф*
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі,
зацверджаным 02.08.2016 г., рэг. № 25-13/185

Мінск, 2020

Распрацоўшчыкі праграмы:
*С.В. Зыгмантовіч*, прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт
*А.В. Прадзеіна*, дацэнт кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэкамендавана да зацвярджэння:

Кафедра культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Пратакол пасяджэння ад 14.01.2020 № 1

Савет Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Пратакол пасяджэння ад 14.01.2020 № 1

# УВОДЗІНЫ

Вучэбная праграма па дысцыпліне «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы» складзена згодна з адукацыйным стандартам перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў па спецыяльнасці 1–23 02 71 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія». Актуальнасць вучэбнай дысцыпліны вызначаецца патрабаваннямі сучаснасці да бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк ва ўмовах інфарматызацыі грамадства, стварэння і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў і сэрвісаў.

Значнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны абумоўлена як фундаментальнай роляй спецыяльных бібліяграфічных ведаў у фарміраванні прафесіянальнага светапогляду спецыялістаў, так і неабходнасцю набыцця канкрэтных прафесійных ведаў у арганізацыі і ажыццяўленні разнастайных кірункаў бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

**Мэта** праграмы: вывучэнне слухачамі пытанняў арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў Беларусі; асаблівасці арганізацыйна-функцыянальнай структуры бібліяграфічных служб бібліятэк розных тыпаў; авалоданне тэхналогіяй і методыкай фарміравання і выкарыстання даведачна-бібліяграфічнага апарату, падрыхтоўкі і прамоцыі бібліяграфічных прадуктаў у традыцыйнай і электроннай формах; задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў у працэсе бібліяграфічнага інфармавання і даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання; фарміравання бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў бібліятэк.

**Задачы** праграмы:

засваенне арганізацыйных асаблівасцей ажыццяўлення бібліяграфічнай дзейнасці рознымі суб’ектамі сістэмы дакументных камунікацый, напрамкаў іх узаемадзеяння на другасна-дакументным узроўні;

разгляд асаблівасцей арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэках розных тыпаў;

раскрыццё складу, асаблівасцей фарміравання і выкарыстання даведачна-бібліяграфічнага апарату як асноўнай базы бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк;

аналіз арганізацыйных і тэхналага-метадычных асаблівасцей выканання розных кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці як у традыцыйным, так і ў аўтаматызаваным рэжымах.

**Метады** навучання: традыцыйныя (метады арганізацыі і ажыццяўлення вучэбна-пазнавальнай дзейнасці слухачоў; метады стымуліравання і матывацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці слухачоў; метады кантроля і самакантроля); актыўныя; інтэрактыўныя.

**Сродкі** навучання: аўдыяльныя, візуальныя, аўдыявізуальныя.

**Асноўныя патрабаванні да вынікаў навучання** ў рамках праграмы.

Слухачы павінны:

*ведаць*:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асаблівасці выканання цэнтрамі бібліяграфічнай дзейнасці функцый адпаведна з займаемым месцам, роляй у сістэме інфармацыйна-дакументных камунікацый грамадства;

кірункі ўзаемадзеяння цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці ў новых умовах выкарыстання інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій, стварэння карпаратыўных інфармацыйных рэсурсаў і сэрвісаў;

асаблівасці структуры бібліяграфічнай службы цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці, у першую чаргу бібліятэк розных тыпаў;

склад даведачна-бібліяграфічнага апарату як асноўнай базы бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, асаблівасці ў новых інфрамацыйна-тэхналагічных умовах, тэхналогіі вядзення і магчымасці выкарыстання лакальнага і віртуальнага даведачна-бібліяграфічнага апарату;

тэхналогію выканання розных кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці як у традыцыйным, так і ў аўтаматызаваным рэжымах.

*умець*:

выкарыстоўваць разнастайныя часткі даведачна-бібліяграфічнага апарату, крыніцы бібліяграфічнай, фактаграфічнай інфармацыі ў розных кірунках бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці;

выкарыстоўваць пошукавыя сродкі інтэрнэту для выяўлення электронных інфармацыйных рэсурсаў, даступных у анлайнавым рэжыме;

аналізаваць нарматыўна-тэхналагічную дакументацыю для засваення працэсаў, аперацый і іх выканання ў канкрэтных бібліяграфічных установах;

выкарыстоўваць лепшы вопыт бібліяграфічнай практычнай дзейнасці, назапашаны рознымі бібліяграфічнымі ўстановамі, а таксама вынікі навуковых распрацовак, накіраваныя на ўдасканаленне бібліяграфічнай дзейнасці;

ажыццяўляць узаемаадносіны з рознымі цэнтрамі бібліяграфічнай дзейнасці;

камплектаваць, выкарыстоўваць розныя часткі даведачна-бібліяграфічнага апарату: каталогі, картатэкі, базы данных, даведачна-бібліяграфічны фонд, фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў;

шукаць і выкарыстоўваць інфармацыйныя рэсурсы, даступныя ў рэжыме аддаленага доступу;

падрыхтоўваць бібліяграфічныя дапаможнікі розных відаў, жанраў, форм, іх рэдагаваць і рэцэнзаваць;

выконваць разавыя запыты карыстальнікаў у працэсе даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання;

ствараць інфармацыйнае асяроддзе ў бібліятэцы і арганізоўваць разнастайныя формы фарміравання бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Назва раздзела, тэмы | Колькасць гадзін | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | **Усяго** | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Круглыя сталы, тэматычныя дыскусіі | Лабараторныя заняткі | Дзелавыя гульні | Трэнінгі | Канферэнцыі | Самастойная работа |
| **1** | **Арганізацыйныя пытанні бібліяграфічнай дзейнасці** | | | | | | | | | | |
| 1.1 | Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь | 14 | 4 | | | | | | | | 8 |
| 1.2 | Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэцы | 12 | 4 | | | | | | | | 8 |
| **2** | **Арганізацыя, тэхналогія і методыка выканання асноўных напрамкаў бібліяграфічнай дзейнасці** | | | | | | | | | | |
| 2.1 | Фарміраванне і выкарыстанне даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі | 20 | 4 | 4 | 4 | | | | | | 8 |
| 2.2 | Стварэнне бібліяграфічнай прадукцыі | 16 | 6 | 4 | 2 | | | | | | 12 |
| 2.3 | Бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк | 22 | 4 | 2 | 4 | | | | | | 10 |
| 2.4 | Фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі | 16 | 6 | | | | | | | | 6 |
| **Усяго:** | | **100** | **28** | **10** | **10** | | | | | | **52** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ПРАГРАМЫ

# Раздзел 1.
# Арганізацыйныя пытанні бібліяграфічнай дзейнасці

### Тэма 1. 1. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь

Бібліяграфічная дзейнасць: азначэнне, задачы, асаблівасці, напрамкі развіцця. Арганізацыя, тэхналогія і методыка бібліяграфічнай дзейнасці: агульная характарыстыка. Асаблівасці арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці. Арганізацыйная структура бібліяграфічнай дзейнасці, прынцыпы яе арганізацыі.

Асноўныя цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь: Нацыянальная кніжная палата Беларусі, бібліятэкі, органы навукова-тэхнічнай інфармацыі, выдавецтвы, кнігагандлёвыя прадпрыемствы, архівы, музеі, сродкі масавай інфармацыі, іх задачы, функцыі, асаблівасці выканання бібліяграфічных кірункаў дзейнасці.

Узаемадзеянне бібліяграфічных цэнтраў краіны – аб’ектыўная неабходнасць на шляху фарміравання адзінай інфармацыйнай прасторы краіны. Асаблівасці ўзаемадзеяння бібліяграфічных цэнтраў краіны. Узаемадзеянне бібліятэк як бібліяграфічных цэнтраў. Карпаратыўнае ўзаемадзеянне бібліятэк Беларусі па стварэнні інфармацыйных рэсурсаў.

### Тэма 1.2. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэцы

Бібліяграфічная служба бібліятэкі: азначэнне, задачы, напрамкі дзейнасці. Асаблівасці цэнтралізаванага і дэцэнтралізаванага характару бібліяграфічнай службы бібліятэкі. Залежнасць яе арганізацыйна-функцыянальнай структуры ад тыпу, задач бібліятэкі, інфармацыйнай інфраструктуры рэгіёна, спецыялізацыі дзейнасці і зместу бібліяграфічных працэсаў.

Асаблівасці арганізацыйна-функцыянальнай структуры бібліяграфічнай службы ў бібліятэках розных тыпаў. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэках, якія не маюць бібліяграфічных падраздзяленняў.

Асноўныя функцыі бібліяграфічнага падраздзялення бібліятэкі. Бібліяграфічныя працэсы ў небібліяграфічных падраздзяленнях бібліятэкі.

Бібліяграфічная служба як аб’ект кіравання. Асаблівасці рэалізацыі асноўных функцый кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел 2.
# Арганізацыя, тэхналогія і методыка выканання асноўных напрамкаў бібліяграфічнай дзейнасці

## Тэма 2.1. Фарміраванне і выкарыстанне даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі

Даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі: яго азначэнне, функцыі, уласцівасці, прынцыпы. Формы існавання розных частак ДБА. Адзінства прынцыпаў і метадычных рашэнняў у фарміраванні ўсіх частак ДБА. Асаблівасці ДБА бібліятэк розных тыпаў. Задачы бібліятэк па развіцці ДБА. Залежнасць ДБА ад тыпу бібліятэкі, спецыфікі яе дзейнасці, тэхнічнай аснашчанасці, складу чытачоў і зместу іх запытаў. Узаемадзеянне бібліятэк па стварэнні і выкарыстанні ДБА. Адзнака якасці даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі, эфектыўнасці яго стварэння і выкарыстання.

Сістэма каталогаў, картатэк, баз даных бібліятэкі: агульная характарыстыка. Асаблівасці электроннага каталога. Зводны каталог: спецыфіка фарміравання, тэндэнцыі развіцця. Базы даных: вызначэнне паняцця, асноўныя тыпы.

Даведачна-бібліяграфічны фонд бібліятэкі (ДБФ): азначэнне, структура, асаблівасці камплектавання і арганізацыі. Асаблівасці камплектавання, прадастаўлення доступу і выкарыстання баз даных ў бібліятэках. Афіцыйныя дакументы, базы даных прававой інфармацыі ў ДБФ бібліятэк Беларусі, іх функцыянальнае прызначэнне і выкарыстанне. Даведачныя выданні і фактаграфічныя базы даных у ДБФ бібліятэкі, іх функцыянальнае прызначэнне і выкарыстанне.

Бібліяграфічныя крыніцы ў ДБФ бібліятэкі: агульная характарыстыка. Асаблівасці і функцыянальнае прызначэнне крыніц агульнай бібліяграфіі. Суадносіны крыніц нацыянальнай і дзяржаўнай бібліяграфіі, іх асаблівасці і функцыянальнае прызначэнне. Характарыстыка і напрамкі выкарыстання ў рабоце бібліятэк крыніц масавай бібліяграфічнай інфармацыі.

Асноўныя віды крыніц спецыяльнай бібліяграфіі ў ДБФ бібілятэк. Крыніцы навукова-дапаможнай бібліяграфіі, іх асаблівасці і функцыянальнае прызначэнне. Значэнне і выкарыстанне ў рабоце бібліятэк крыніц папулярнай (рэкамендацыйнай) бібліяграфіі.

Сучасныя тэндэнцыі арганізацыі доступу і выкарыстання электронных інфармацыйных рэсурсаў навуковага цытавання ў бібліятэках.

Сеткавыя рэсурсы ў структуры ДБА бібліятэкі: асаблівасці, значэнне. Электронны пуцевадзіцель як форма арганізацыі сеткавых рэсурсаў.

Фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў: прызначэнне, асаблівасці вядзення ў бібліятэках розных тыпаў. Значэнне і спецыфіка выкарыстання архіваў віртуальных даведачных служб.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 2.2. Стварэнне бібліяграфічнай прадукцыі

Асноўныя тэхналагічныя працэсы падрыхтоўчага этапу вытворчасці бібліяграфічнай прадукцыі. Выбар тэмы дапаможніка і яе вывучэнне. Складанне плана-праспекта дапаможніка, яго прызначэнне і змест. Выяўленне дакументаў, мэта і тэхналагічная характарыстыка.

Асноўныя працэсы аналітычнага этапу падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў. Агульны бібліяграфічны аналіз дакумента: яго мэта і змест. Бібліяграфічнае апісанне і асноўныя патрабаванні да яго. Тэхналогія працэсаў анатавання і рэферыравання. Індэксаванне і прадметызацыя дакументаў. Складанне бібліяграфічных запісаў – канчатковы вынік аналітычнага этапу бібліяграфавання.

Мэты і асноўныя працэсы сінтэтычнага этапу складання бібліяграфічных дапаможнікаў. Адбор дакументаў, яго віды і крытэрыі адбору. Групоўка бібліяграфічных запісаў, яе мэта і асноўныя віды.

Мэты і асноўныя працэсы заключнага этапу падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў. Даведачна-метадычны аппарат бібліяграфічнага дапаможніка і асаблівасці яго падрыхтоўкі. Віды дапаможных паказальнікаў і методыка іх стварэння. Навуковае, літаратурнае і бібліяграфічнае рэдагаванне бібліяграфічнага дапаможніка, яго афармленне.

Базы даных: тэхналогія фарміравання.

## Тэма 2.3. Бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк

Бібліяграфічнае абслугоўванне: азначэнне, асноўныя віды. Інфармацыйныя патрэбнасці карыстальнікаў: паняцце і сутнасць. Метады вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей.

Бібліяграфічнае інфармаванне: асноўныя віды. Масавае бібліяграфічнае інфармаванне: сутнасць, асноўныя формы. Бюлетэні (картатэкі, базы даных) новых паступленняў у бібліятэкі, выставы, бібліяграфічныя агляды, «Дзень інфармацыі»: спецыфіка падрыхтоўкі, выкарыстання ў рабоце бібліятэк.

Дыферэнцыраванае бібліяграфічнае інфармаванне: азначэнне, формы, асаблівасці тэхналогіі. Індывідуальнае бібліяграфічнае інфармаванне: асноўныя формы. Сістэма выбарчага распаўсюджвання інфармацыі (ВРІ): спецыфіка, прынцыпы яго функцыянавання, формы. Дыферэнцыраванае абслугоўванне кіраўнікоў (ДАК): сутнасць, асаблівасці. RSS-рассылкі як форма бібліяграфічнага інфармавання. Выкарыстанне паслуг служб бягучага абвяшчэння агрэгатараў баз данных.

Спецыфіка групавога бібліяграфічнага інфармавання. Тэматычныя спісы (бюлэтэні) новых паступленняў, кальцавая пошта, «Дзень спецыяліста»: асаблівасці падрыхтоўкі, выкарыстання ў дзейнасці бібліятэк. Вывучэнне эфектыўнасці бібліяграфічнага інфармавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне: азначэнне, спецыфіка, асноўныя элементы. Тэхналогія даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання: прыём запыту; устанаўленне кола крыніц, неабходных для аптымальнага задавальнення запыту; пошук бібліяграфічнай, фактаграфічнай інфармацыі; афармленне даведкі; улік вынікаў даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання; выдача ці накіраванне яе абаненту. Спецыфіка выканання бібліяграфічных (тэматычных, удакладняючых, адрасных) і фактаграфічных даведак. Вывучэнне эффектыўнасці даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання.

Асаблівасці даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання ў электронным асяроддзі. Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне аддаленых карыстальнікаў бібліятэк. Віртуальныя даведачныя службы: тэхналогія, рэжымы функцыянавання.

## Тэма 2.4. Фарміраванне бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў інфармацыі

Бібліяграфічная культура як састаўная частка інфармацыйнай культуры. «Бібліяграфічная культура»: змест, азначэнне паняцця, суадносіны з паняццем «інфармацыйная культура». Значэнне бібліяграфічнай культуры асобы ў сучасных умовах. Сістэма фарміравання бібліяграфічнай культуры асобы ў краіне. Арганізацыя дзейнасці бібліятэк, іх роля і задачы, напрамкі работы па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі.

Класіфікацыя форм фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі па розных прыметах: у залежнасці ад масавасці аўдыторыі; месца правядзення; спосабаў перадачы і фарміравання бібліяграфічных ведаў, уменняў і навыкаў.

Масавыя, групавыя, індывідуальныя формы фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі, спецыфіка іх арганізацыі і правядзення. Арганізацыя, змест, праграмнае і метадычнае забеспячэнне, выкарыстоўваемыя формы работы бібліятэк розных тыпаў па фарміраванні бібліяграфічнай культуры школьнікаў, студэнтаў, спецыялістаў. Асаблівасці фарміравання бібліяграфічнай культуры асобных груп карыстальнікаў інфармацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ САМАСТОЙНАГА ВЫВУЧЭННЯ

### Тэма 1. 1. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь

***Пытанні***

1. Даць характарыстыку інфармацыйным рэсурсам цэнтраў бягучага бібліяграфічнага ўліку нацыянальнага дакумента.

Прааналізаваць бібліяграфічную дзейнасць цэнтраў па бягучаму ўліку адпаведных відаў дакументаў, выявіць, даць характарыстыку інфармацыйным рэсурсам (бібліяграфічным, фактаграфічным, паўнатэкставым, камбінаваным), якія адлюстроўваюць дзейнасць цэнтраў у даным накірунку ў адпаведнасці з прадстаўленай схемай.

*Цэнтры бягучага бібліяграфічнага ўліку асобных відаў дакументаў:*

Нацыянальная кніжная палата Беларусі (НКП) – друкаваных выданняў, якія выдадзены ў Беларусі, а таксама публікацый беларускіх аўтараў, аб Беларусі, на беларускай мове, якія выдадзены за межамі краіны;

Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) – дысертацый;

Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі (НЦПІ) – афіцыйных выданняў (прававых актаў);

Дзяржаўная ўстанова «Беларускі інстытут сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы» (БелІСА) – справаздач аб навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх, вопытна-тэхналагічных прац, дэпаніраваных навуковых прац;

Беларускі дзяржаўны інстытут стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС) – стандартаў (тэхнічных нарматыўных прававых актаў);

ДУ «Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці» (НЦІУ), Рэспубліканская навукова-тэхнічная бібліятэка (РНТБ) – патэнтных дакументаў;

НІРУП «Інстытут прыкладных праграмных сістэм» (НІРУП «ІППС») – інфармацыйных рэсурсаў (БД і інш.);

НКП Беларусі, Спецыялізаваная гарадская бібліятэка для сляпых – філіял ГУ «ЦСГПБ г. Мінска» – выданняў для інвалідаў па зроку і са слабым зрокам.

Абласныя бібліятэкі – мясцовыя дакументы.

*Схема апісання электронных інфармацыйных рэсурсаў:*

1. Базы даных, электронныя каталогі:

1.1 назва;

1.2 від дакумента;

1.3 утрыманне;

1.4 аб’ём (па-магчымасці);

1.5 пошук.

2. Электронныя бібліяграфічныя паказальнікі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2.1 самастойныя прадукты ці электронныя версіі друкаваных;
2.2 выгляд дакумента;
2.3 назва;
2.4 утрыманне;
2.5 доступ;
2.6 пошук па зместу.
3. Паўнатэкставыя рэсурсы:
3.1 арыгінальныя, створаныя для сайта, агульная характарыстыка;
3.2. адсканіраваныя версіі папяровых дакументаў, агульная характарыстыка;
3.3. выгляд дакумента;
3.4. назва;
3.5. утрыманне;
3.6. доступ.

2. Ахарактарызаваць карпаратыўныя праекты бібліятэк Беларусі:

Зводны электронны каталог бібліятэк Беларусі http://unicat.nlb.by/index.html.be

Нацыянальная база даных аўтарытэтных запісаў

https://nlb.by/content/informatsionnye-resursy/elektronnye-informatsionnye-resursy/svodnye-resursy-bibliotek-belarusi/

«Сводный электронный каталог статей LibКАРД» https://www.pac.by/about/structure/units/library/corporate-interaction/

Зводны электронны інфармацыйны рэсурс нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі
http://eir.nlb.by/wps/portal/eir/!ut/p/a1/hY5LD4IwEIR_iweudJWHaGIMKoH6DF7EXkyJtWBqIbWK_nuRmHjxsZfNbL6ZWURQgoik15xTnReSiqcm7s7CPTfyoIO9VScAvJyMHMdetiGGGtjWAHwZH_75N4g0yDj0I7s7BwhjewS4u1jNgrVnAXZfwI-KKSJcFGnz7taXqeVxRBQ7MMWUeVH1OdO67BtgQFVVphSpmd4NKAulqag35eytcrlnt6Ggkg_U5VNgVpw1St5BqDwlcHTEde63Wg-XBY-U/dl5/d5/L0lDUmlTUSEhL3dHa0FKRnNBLzRKVXBDQSEhL2Jl/

«Ученые Беларуси»
http://unicat.nlb.by/scient/auth_e.html

«Беларусь у асобах і падзеях» http://wcent.nlb.by/factualdbtest/view/faces/Main.jspx

Віртуальная чытальная зала НББ
https://www.nlb.by/by/paslugi/virtualnyya-servisy/virtualnaya-chytalnaya-zala/

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Раскрыть вопыт рэгіянальнага ўзаемадзеяння бібліятэк ў рамках бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэцы (месца працы слухача).

*Спіс рэкамендаванай літаратуры*

1. Нацыянальная бібліяграфія Беларусі: методыка стварэння і выкарыстання электронных інфармацыйных рэсурсаў : навук.-метад. выданне / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2016. – С. 10–22 ; 36–84. – (Серыя «БібліяКансультант»).

2. Кузьминич, Т. В. Корпоративность как приоритет современной информационно-ресурсной политики Национальной библиотеки Беларуси / Т. В. Кузьминич // Бібліятэчны веснік : навуковы зборнік / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мінск, 2016. – Вып. 7. – С. 7–21.

## Тэма 1.2. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэцы

*Пытанні*

1. Азначэнне, задачы, напрамкі дзейнасці, характар бібліяграфічнай службы бібліятэкі.

2. Характарыстыка арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэцы (месца працы слухача). Раскрыць віды, формы, асаблівасці планавання, уліку і справаздачы аб бібліяграфічнай дзейнасці. Прывесці ўзоры.

*Спіс рэкамендаванай літаратуры*

1. Абросимова, Н. В. Библиографическая деятельность библиотеки : учебно-практическое пособие / Н. В. Абросимова. – Санкт-Петербург : Профессия, 2013. – 159 с. : ил. – (Азбука библиотечной профессии).

2. Зыгмантовіч, С. В. Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці : вучэб. дапаможнік / С. В. Зыгмантовіч. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2006. – С. 45–66. – Тое ж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://hdl.handle.net/123456789/4676. – Дата доступу : 05.01.2020.

3. Зыгмантовіч, С. В. Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэкі : вучэбны дапаможнік / С. В. Зыгмантовіч ; [сярод рэц.: В. І. Саітава]. – Мінск : [б. в.], 2009. – С. 7–50. – Тое ж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http:// repository.buk.by/123456789/15510.– Дата доступу : 05.01.2020.

4. Справочник библиографа / [О. А. Александрова и др. ; науч. редакторы: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева]. – 4-е изд., испр. и доп. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. — С. 688–707.

5. Управление библиографической деятельностью библиотеки : метод. рекомендации / Учреждение культуры «Могилевская областная библиотека им. В. И. Ленина», Информационно-справочный отдел ; сост. Н. В.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дробышева ; редакторы: А. М. Харевич, Е. А. Хальчицкая. – Могилев : Могилевская областная библиотека, 2015. — 31 с.

## Тэма 2.1. Фарміраванне і выкарыстанне даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі

### *Пытанні*

1. Даць характарыстыку структуры, стану даведачна-бібліяграфічнага апарата (ДБА) бібліятэкі (месца працы слухача), яго фарміравання і выкарыстання:

асаблівасці ДБА бібліятэкі;

сістэма каталогаў, картатэк, баз даных бібліятэкі: агульная характарыстыка;

даведачна-бібліяграфічны фонд бібліятэкі (ДБФ);

бібліяграфічныя крыніцы ў ДБФ бібліятэкі;

асноўныя віды крыніц спецыяльнай бібліяграфіі ў ДБФ бібілятэкі;

сеткавыя рэсурсы ў структуры ДБА бібілятэкі;

фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў.

Паказаць, якія метады выкарыстоўваюцца ў бібліятэцы для адзнакі якасці даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі, эфектыўнасці яго стварэння і выкарыстання.

### *Спіс рэкамендаванай літаратуры*

1. Абросимова, Н. В. Библиографическая деятельность библиотеки : учебно-практическое пособие / Н. В. Абросимова. – Санкт-Петербург : Профессия, 2013. – С. 56–65. – (Азбука библиотечной профессии).

2. Аналитико-синтетическая переработка информации : учебник / Н. И. Гендина [и др.] ; науч. ред. А. В. Соколов. – СПб. : Профессия, 2016. – С. 287–309.

3. Зыгмантовіч, С. В. Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці : вучэб. дапаможнік / С. В. Зыгмантовіч. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2006. – С. 67–212. – Тое ж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://hdl.handle.net/123456789/4676. – Дата доступу : 05.01.2020.

4. Справочник библиографа / [О. А. Александрова и др. ; науч. редакторы: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева]. – 4-е изд., испр. и доп. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. — С. 608–627.

5. Справочно-поисковый аппарат библиотеки : учебник / под ред. И. С. Пилко. – Санкт-Петербург : Профессия, 2015. – С. 26–93 ; 251 – 272.

## Тэма 2.2. Стварэнне бібліяграфічнай прадукцыі

### *Пытанні*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Скласці электронны пуцевадзіцель па інтэрнэт-рэсурсах па вызначанай тэме. Неабходна прадставіць не больш 15 анатаваных бібліяграфічных запісаў на розныя віды інтэрнэт-рэсурсаў у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі да іх.

2. Скласці бібліяграфічны агляд. Для выяўлення дакументаў неабходна выкарыстаць розныя віды крыніц інфармацыі: карткавыя каталогі (картатэкі), друкаваныя бібліяграфічныя дапаможнікі, базы даных (айчынных і замежных вытворцаў), інтэрнэт-рэсурсы. Спіс літаратуры па тэме агляда павінен уключаць не больш 15 бібліяграфічных апісанняў на розныя віды дакументаў, складзеных у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі да іх.

### *Спіс рэкамендаванай літаратуры*

1. Абросимова, Н. В. Библиографическая деятельность библиотеки : учебно-практическое пособие / Н. В. Абросимова. – Санкт-Петербург : Профессия, 2013. – С. 51–55 ; 119–123. – (Азбука библиотечной профессии).

2. Аналитико-синтетическая переработка информации : учебник / Н. И. Гендина [и др.] ; науч. ред. А. В. Соколов. – СПб. : Профессия, 2016. – С. 182–225 ; 253–286.

2. Зыгмантовіч, С. В. Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці : вучэб. дапаможнік / С. В. Зыгмантовіч. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2006. – С. 213–240. – Тое ж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://hdl.handle.net/123456789/4676. – Дата доступу : 05.01.2020.

3. Зыгмантович, С. В. Подготовка библиографической продукции библиотеками : научно-практическое пособие / С.В. Зыгманович. – Минск : Новое знание, 2009. – С. 62–169.

4. Справочник библиографа / [О. А. Александрова и др. ; науч. редакторы: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева]. – 4-е изд., испр. и доп. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. — С. 516–531; 601–607.

5. Справочно-поисковый аппарат библиотеки : учебник / под ред. И. С. Пилко. – Санкт-Петербург : Профессия, 2015. – С. 77–89.

## Тэма 2.3. Бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк

### *Пытанні*

1. Даць характарыстыку бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў у бібліятэцы (месца працы слухача).

### *Спіс рэкамендаванай літаратуры*

1. Абросимова, Н. В. Библиографическая деятельность библиотеки : учебно-практическое пособие / Н. В. Абросимова. – Санкт-Петербург : Профессия, 2013. – С. 66–79. – (Азбука библиотечной профессии).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Аналитико-синтетическая переработка информации : учебник / Н. И. Гендина [и др.] ; науч. ред. А. В. Соколов. – СПб. : Профессия, 2016. – С. 182–225 ; 253–286.
3. Зыгмантовіч, С. В. Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці : вучэб. дапаможнік / С. В. Зыгмантовіч. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2006. – С. 213–240. – Тое ж [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://hdl.handle.net/123456789/4676. – Дата доступу : 05.01.2020.
4. Зыгмантович, С.В. Подготовка библиографической продукции библиотеками : научно-практическое пособие / С. В. Зыгманович. – Минск : Новое знание, 2009. – С. 62–169.
5. Справочник библиографа / [О. А. Александрова и др. ; науч. редакторы: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева]. – 4-е изд., испр. и доп. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. — С.628– 687.
6. Справочно-поисковый аппарат библиотеки : учебник / под ред. И. С. Пилко. – Санкт-Петербург : Профессия, 2015. – С. 19–25.

## Тэма 2.4. Фарміраванне бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў інфармацыі

***Пытанні***

1. Пазнаёміцца, прааналізаваць, даць прапановы асноўныя формы і змест работы бібліятэкі (месца працы слухача) па фарміраванню бібліяграфічнай культуры карыстальнікаў.

***Спіс рэкамендаванай літаратуры***

1. Амелин, Р. В. Информационная безопасность [Электронный ресурс] / Р. В. Амелин. – Режим доступа: http:// nto. immpu.sgu.ru/sites/default/files/3/77037.pdf. – Дата доступа: 05.01.2020.
2. Библиотечное обслуживание молодежи в Японии, России и США / гл. ред. Л. Фармер ; ред.: Н. Гендина, Ю. Накамура ; [пер. с англ. Е. В. Малявской и др.]. – Москва, 2013. – С. 24–41; 187–209 ; 267–287. – (Проф. б-ка шк. библиотекаря : прил. к журн. «Школьная библиотека». Серия 1 ; вып. 3–4).
